**УДК 821.161.3.09-3(091),,19''+82.0**

# ПРЫНЦЫПЫ ТЫПАЛАГІЗАЦЫІ ЛІТАРАТУРНЫХ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У РАБОТАХ СУЧАСНЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

***А.М. ЧАРНАВОКАЯ***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)***
***lecsa87@gmail.com***

*Мэта артыкула – суаднесці тыпалогіі жаночых вобразаў, прапанаваныя ў сучасных даследаваннях, з тыпалогіямі вобразаў-персанажаў, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца ў літаратуразнаўстве. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца работы беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх навукоўцаў (І. Воюш, В. Кардапольцава, А. Пакіна, Т. Емчук і інш.). Робіцца выснова, што развіццё гендарных даследаванняў пакуль не прывяло да выпрацоўкі кардынальна новых падыходаў да тыпалагізацыі жаночых персанажаў. Пры распрацоўцы тыпалогіі жаночых вобразаў даследчыкі, як правіла, вылучаюць тыпы на падставе аўтарскага стаўлення да персанажаў, вызначэння псіхалагічных, сацыяльных, сацыяльна-гістарычных тыпаў, сюжэтнай функцыі персанажаў – а значыць, арыентуюцца на класічныя літаратуразнаўчыя падыходы. Тыпалогіі жаночых вобразаў найчасцей з'яўляюцца эмпірычнымі і іманентнымі, асноўная ўвага ў даследаваннях надаецца абумоўленасці канструявання жаночых вобразаў сацыякультурнай сітуацыяй.*

***Ключавыя словы:*** *жаночыя вобразы, тыпалогія, сучаснае літаратуразнаўства, гендарныя даследаванні, сацыяльныя тыпы, псіхалагічныя тыпы.*

**Уводзіны.** Да праблемы тыпалогіі вобразаў-персанажаў у мастацкай прозе звярталіся многія расійскія і замежныя літаратуразнаўцы і культуролагі, якія ўдакладнялі традыцыйныя літаратуразнаўчыя падыходы альбо прапаноўвалі ўласныя тыпалогіі (сёння іх колькасць большая за некалькі дзясяткаў). У канцы XX – пачатку XXI стагоддзя асаблівую актуальнасць набыла праблема тыпалогіі жаночых персанажаў, што абумоўлена развіццём гендарных даследаванняў, пашырэннем цікавасці да вывучэння асаблівасцей канструявання і рэпрэзентацыі жаноцкасці. На працягу доўгага часу жаночыя вобразы ў мастацкай (пераважна «мужчынскай») літаратуры знаходзіліся на перыферыі ўвагі даследчыкаў. У постсавецкі перыяд літаратуразнаўцы звярнуліся да аналізу жаночых вобразаў і сутыкнуліся з надзвычай супярэчлівымі падыходамі да канструявання жаноцкасці.

У праграмным эсэ феміністкай крытыкі «Другі пол» Сімона дэ Бавуар падкрэслівала разнастайнасць і супярэчлівасць жаночых вобразаў у еўрапейскай культуры, наступным чынам характарызуючы міф пра жанчыну: «Апісаць міф заўседы складана; яго ніяк не ахопіш, не акрэсліш, ён неадступна прысутнічае ў свядомасці людзей, але ніколі не паўстае перад імі як застылы аб'ект. Ён настолькі зменлівы, настолькі супярэчлівы, што не адразу разумееш, наколькі ён цэласны: Даліла і Юдзіф, Аспазія і Лукрэцыя, Пандора і Афіна, жанчына – гэта адначасова Ева і Дзева Марыя. Яна ідал, служка, крыніца жыцця, магутнасць цемры; яна – лекарка і вядзьмарка; яна – здабыча мужчыны, яна ж – ягоная параза, яна – усё, чым ён не з'яўляецца, але што хоча мець, яна яго адмаўленне і сэнс яго жыцця» [1, с. 184].

У мастацкай літаратуры жанчына паўстае ў розных іпастасях; у межах розных літаратурных жанраў і стыляў выпрацоўваюцца розныя стратэгіі рэпрэзентацыі жаноцкасці. Адпаведна, пры аналізе жаночых вобразаў у вялікім корпусе тэкстаў (аднаго аўтара, жанру, літаратурнага кірунку, гістарычнай эпохі) абавязковым, першасным этапам з'яўляецца распрацоўка тыпалогіі, прадуктыўнай для аналізу і супастаўлення жаночых персанажаў. У канцы XX – пачатку XXI стст. у расійскім, украінскім, беларускім літаратуразнаўстве з'явілася дастаткова вялікая колькасць работ, прысвечаных гэтай праблеме (што адлюстравана ў іх назвах). Мэта дадзенага артыкула – суаднесці тыпалогіі жаночых вобразаў, прапанаваныя ў сучасных даследаваннях, з тыпалогіямі вобразаў-персанажаў, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца ў літаратуразнаўстве; вызначыць асноўныя прынцыпы тыпалагізацыі жаночых вобразаў.

**Тыпалогіі вобразаў-персанажаў.** Сістэма персанажаў – адзін з галоўных аспектаў кампазіцыі твораў. Яна з'яўляецца кампанентам «змястоўнай формы» і выконвае дзве функцыі: канструктыўную (фарміруе структурнае адзінства твора) і змястоўную (раскрывае логіку мастацкай задумы, з'яўляецца праваднікам аўтарскай канцэпцыі). Вызначэнне ўзаемаадносенасці персанажаў патрабуе шматаспектнага разгляду асобных вобразаў, што адбываецца праз зварот да тыпалогій вобразаў-персанажаў, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца пры аналізе мастацкіх твораў. Работы М. Бахціна, Н. Тамарчанкі, Е. Ганчаровай і інш. дазваляюць вылучыць наступныя тыпалогіі персанажаў:

1. Паводле ступені ўдзелу выяўленых асоб у падзеях, іх блізкасці да аўтара альбо аўтарскай зацікаўленасці: галоўныя, другасныя і толькі згаданыя персанажы.

2. Паводле «ролі выяўленых асоб у сюжэце» [2, с. 249], ступені індывідуалізацыі, выяўлення «ўнутранага» аспекту: персанаж, характар, тып (псіхалагічны, сацыяльны, сацыяльна-гістарычны, нацыянальны). Меркаванні М. Бахціна [3, с. 13] і Н. Тамарчанкі па праблеме тыпалогіі персанажаў дазваляюць уключыць у гэты пералік вобразы-амплуа («“салдат-хвалько”, круцель у старажытных камедыях; інжэню (прастачка) у сентыментальным рамане, альбо вучоны дзівак у рамане авантурна-геаграфічным» [2, с. 253]. Амплуа, тоесныя сваёй сюжэтнай функцыі і ў адрозненні ад тыпаў, утрымліваюць мінімальную інфармацыю пра сацыякультурны кантэкст.

3. Аналіз суб’ектна-апавядальнай структуры мастацкага тэксту дазваляе супрацьпаставіць персанажа, які выступае ў ролі апавядальніка (аповед у творы вядзецца ад першай асобы (Ich – Ërzehlung), персанажам, якія з’яўляюцца «маўленчымі асобамі» ў творах з «аб’ектыўным» апавядальнікам, максімальна набліжаным да аўтара (Er – Ërzahler) [4].

4. Персанажы могуць быць супрацьпастаўлены як носьбіты ўзаемавыключальных якасцей: пара – самы старажытны варыянт сістэмы галоўных герояў у канкрэтным творы. Адным з найбольш архаічных выпадкаў з’яўляецца супрацьпастаўленне дабра і зла, адмоўнага і станоўчага героя (Бог і д’ябал, Каін і Авель у Бібліі). Менавіта гэту тыпалогію ў першую чаргу згадвае М. Бахцін на падставе вызначэння аўтарскага стаўлення да персанажаў [2, с. 13]. Недахоп гэтай тыпалогіі – няпоўны ахоп вылучанага мноства (усіх персанажаў па прынцыпу дзялення з супярэчнымі членамі можна падзяліць на станоўчых і не-станоўчых, але не ўсе не-станоўчыя персанажы будуць з’яўляцца адмоўнымі). Тым не менш у літаратуразнаўчых слоўніках і даведніках можна знайсці вызначэнні паняццяў «адмоўны персанаж», «станоўчы персанаж», «вобраз-ідэал», што сведчыць пра частотнасць і нарматыўнасць выкарыстання гэтага прынцыпу стратыфікацыі персанажаў.

5. Тыпалогія персанажаў можа быць распрацавана на падставе вызначэння сюжэтных функцый. Найбольшую вядомасць мае тыпалогія вобразаў-персанажаў, прадстаўленая В. Пропам у даследаванні «Марфалогія чароўнай казкі». Даследчык вылучыў сем колаў дзеяння і, адпаведна, сем тыпаў персанажаў: антаганіст (шкоднік); дароўца; памагаты; царэўна і яе бацька (якіх шукаюць); адпраўшчык; герой; несапраўдны герой [5, с. 60].

Адначасова з У. Пропам і незалежна ад яго французскі эстэтык Э. Сурыё ў кнізе «200 000 драматычных сітуацый» прапанаваў блізкую па канцэпцыі тыпалогію персанажаў, заснаваную на іх сюжэтных функцыях у драматычных сітуацыях [6, с. 254]. На падставе прац У. Пропа і Э. Сурыё сфармаваліся два падыходы да тыпалогіі персанажаў. Так, следам за У. Пропам структуралісты не бралі ў разлік псіхалагічную трактоўку персанажа і вызначалі яго як «удзельніка» дзеі, агента паслядоўнасці здзейсненых ім учынкаў [7, с. 407]. Ц. Тодараў вылучыў тыпы стасункаў, у якія могуць уступаць персанажы і назваў іх базавымі прэдыкатамі (стасункі любві, камунікацыі і дапамогі). А.-Ж. Грэймас прапанаваў размеркаваць персанажаў, адпаведна, па трох восях: вось жадання (альбо пошуку), вось камунікацыі і вось выпрабаванняў. У выніку бясконцая колькасць персанажаў можа быць змешчана ў парадыгматычную структуру: Суб’ект / Аб’ект, Адрасант (Давальнік) / Адрасат (Атрымальнік), Памагаты / Супернік [7, с. 408].

Літаратуразнаўцы, якія займаліся праблемамі аўтаразнаўчай паэтыкі, наадварот арыентаваліся на распрацоўку тыпалогій персанажаў як адкрытых сістэм, якія могуць удакладняцца і пашырацца. Зыходнай устаноўкай стаў тэзіс, што вобразы-персанажы часта з’яўляюцца вобразамі-матывамі, належаць да ўзроўню топікі, іх можна разглядаць як топасы – «агульныя месцы, элементарныя тэматыка-стылістычныя ўзоры» [8, с. 358]. Як адзначаў М. Гаспараў, многія жанры, якія атрымалі развіццё ў пэўную эпоху, прадугледжваюць «дастаткова выразны, звыклы набор вобразаў і матываў» [9, с. 13]. Нават вобразы ўнікальныя, прэцэдэнтныя для літаратуры пэўнай эпохі, часта з’яўляюцца лейтматывамі ў творчасці канкрэтнага аўтара, які з твору ў твор стварае вобразы герояў аднаго светапогляду, тэмпераменту, роду дзейнасці і г.д. Так, даследчык творчасці Дастаеўскага Р. Клейман прапанаваў «больш “жорсткаму” паняццю “тып” супрацьпаставіць “матыў”, тыпалогіі герояў – даследаванне матываў, якія дазваляюць раскрыць адметнасць асноўных характараў у творчасці пісьменніка» [10, с. 7].

Апісанне сістэмы персанажаў праз даследаванне матываў, літаратурных універсалій вызваляе ад неабходнасці тэарэтычнага рэканструявання найбольш істотных характарыстык аб’ектаў для аб’яднання іх у адзін тып. Аднак вынікам такога даследавання таксама з’яўляецца вылучэнне асобных груп персанажаў, якім уласцівы аднолькавыя прыкметы. Так, Л. Гросман і В. Адзінокаў вылучылі ў прозе Дастаеўскага такія тыпы, як «летуценнікі», «двайнікі», «падпольныя», «сладастраснікі», «дабраахвотныя блазны», «праведнікі», «цёмныя дзялкі», «гордыя людзі», «героі, ахопленыя д’яблавым духам», «абсалютна прыгожыя людзі» і г.д. Д. Поль разгледзеў у творчасці М. Шолахава тыпы героя-стваральніка, вандроўніка, абаронцы, ахоўніка, каханай [11]. Тыпалогіі вобразаў-персанажаў распрацоўваюцца таксама на матэрыяле творчасці І. Тургенева, Л. Талстога і іншых пісьменнікаў-класікаў.

**Тыпалогіі жаночых вобразаў у мастацкай прозе: сучасны погляд.** Прыведзеныя тыпалогіі шырока выкарыстоўваюцца ў літаратуразнаўстве, і аналіз жаночых вобразаў немагчымы без іх уліку.

Вынік звароту да першых трох тыпалогій з'яўляецца дастаткова прадказальным. Паводле ступені ўдзелу выяўленых асоб у падзеях, іх ролі ў падзеях і суб'ектна-апавядальнай структуры мастацкага тэксту большасць жаночых персанажаў сусветнай літаратуры адносяцца да другасных персанажаў, персанажаў-тыпаў альбо вобразаў-амплуа, якія з'яўляюцца «маўленчымі асобамі». У творах пісьменнікаў-мужчын альтэр-эга аўтара (апавядальнікам ці вобразам-характарам), як правіла, з'яўляецца мужчына. У мастацкай прозе ёсць нямала выдатных выключэнняў. Гэта раман Д. Дзідро «Манахіня» (у форме нататак), навэла С. Цвэйга «Ліст незнаёмкі», напісаныя ад імя жанчын; раманы Г. Флабэра «Мадам Бавары» і Л. Талстога «Ганна Карэніна», дзе выдатна распрацаваны жаночыя характары, і інш. Гэты шэраг можна працягваць, але яскравыя выключэнні ў гэтым выпадку толькі падкрэсліваюць агульную заканамернасць. Адпаведна, даследчыкі, якія аналізуюць жаночыя вобразы ў творчасці пэўнага аўтара, як правіла, вылучаюць тыпы на падставе аўтарскага стаўлення да персанажаў (1), вызначэння псіхалагічных, сацыяльных, сацыяльна-гістарычных тыпаў (2), сюжэтнай функцыі персанажаў (3).

Супастаўленне жаночых вобразаў часта адбываецца праз зварот да бінарнай апазіцыі станоўчы – адмоўны (1) Так, А. Шчарбак аналізуе ўкраінскую літаратуру XII–XVIII стст. і вылучае чатыры тыпы жаночых вобразаў: гістарычныя персанажы, «рэлігійныя жанчыны» (у тым ліку святыя), «грэшніцы», «лірычна-побытавы тып жаночых персанажаў». Рэлігійныя жанчыны і грэшніцы супрацьпастаўляюцца не толькі на падставе паводзін і светапогляду, але і з улікам станоўчага ці адмоўнага стаўлення аўтараў да гераінь, пазіцыянавання гераінь як прыкладу, ідэалу альбо, наадварот, як парушальніц маральных і сацыяльных норм [12]. У дачыненні да рускай прозы XIX ст. Я. Строганава адзначае, што тыпалогія жаночых персанажаў, «якая грунтуецца на фактары натуры, у цэлым укладаецца ў апазіцыю ведзьма / анёл» [13, с. 32]. Н. Сенчыла ў артыкуле, прысвечаным тыпалогіі жаночых вобразаў у турэцкай сацыяльнай навеле першай паловы XX ст., на падставе пазітыўнай і негатыўнай ацэнкі аўтараў супрацьпастаўляе сумленных гераінь і «повій» – прадстаўніц найстаражытнейшай у свеце прафесіі [14].

Фактар аўтарскай ацэнкі з'яўляецца вызначальным, але падстава для супрацьпастаўлення адмоўных і станоўчых гераінь у літаратуры розных гістарычных перыядаў з'яўляецца рознай, што абумоўлена заангажаванасцю аўтараў рознымі праблемамі, спецыфікай светаўспрымання, уласцівай канкрэтнай эпосе. У старажытнай літаратуры выключнае значэнне маюць рэлігійныя нормы – адпаведна, жанчыне-антыідэалу супрацьпастаўляецца рэлігійная жанчына, арыентаваная на духоўнае развіццё і самаўдасканаленне. У рускай літаратуры XIX ст. станоўчую ацэнку атрымлівае гераіня, якая з'яўляецца ўвасабленнем ідэалу жаноцкасці, для пісьменнікаў істотная не толькі духоўная дасканаласць гераіні, але і яе адпаведнасць мужчынскім уяўленням пра ідэальную спадарожніцу жыцця. У турэцкай навеле першай паловы XX ст. асабліва значэнне набывае праблема сумленнасці, здольнасці супрацьстаяць жыццёвым спакусам і захаваць жаночую годнасць, што сведчыць пра выключную вастрыню сацыяльных праблем у тагачасным грамадстве. Такім чынам, станоўчыя і адмоўныя гераіні ёсць у творах розных перыядаў, але падставы для іх супрацьпастаўлення яскрава адрозніваюцца, што вызначаецца спецыфікай культурных, сацыяльных, палітычных, маральна-этычных арыенціраў канкрэтнай эпохі.

Даследаванне жаночых вобразаў у творчасці пісьменнікаў-рэалістаў, як правіла, прадугледжвае апісанне і характарыстыку сацыяльных і сацыяльна-гістарычных тыпаў (2), якая ажыццяўляецца ў межах культурна-гістарычнага падыходу. Аналіз тыпаў сялянкі, эмансіпаткі, рэвалюцыянеркі і г.д. з'яўляецца традыцыйным для літаратуразнаўства XX ст. Так, А. Бярозкіна ў жаночай раманістыцы 70–80 гг. XIX ст. вылучае тыпы «новай жанчыны» – дзейснай пераўтваральніцы, цэласнай натуры, якая на практыцы ажыццяўляе ідэал разумнага шчаслівага жыцця [15, с. 9] і «жанчыны на ростанях», не здольнай хутка далучыцца да сваіх больш рашучых і актыўных сучасніц. У даследаванні Ф. Ісмаілавай на матэрыяле казахскай савецкай літаратуры апісваюцца вобразы камуністак, камсамолак, перадавых работніц [16].

Пашыраным сюжэтам у сучасных літаратуразнаўчых даследаваннях, прысвечаных прозе канца XIX – першай паловы XX ст., з'яўляецца супастаўленне «мадэрнізаваных» і «традыцыйных» гераінь. Дас-ледчыкі аналізуюць стаўленне пісьменнікаў да мадэрнізацыйных працэсаў і «жаночага пытання», звяртаюцца да праблем выхавання, адукацыі, кахання і шлюбу.

Так, Л. Хуан-Сін «у залежнасці ад асаблівасцей унутранага свету, паводзін, ролі ў грамадстве» прапануе наступную тыпалогію гераінь у творах А. Чэхава: 1) «новая жанчына»: жанчына, якая імкнецца да самастойнасці, бярэ на сябе абавязкі выканання традыцыйна мужчынскай ролі ў грамадстве; 2) «традыцыйная жанчына», якая бачыць сваё шчасце ў выкананні традыцыйна жаночай ролі; 3) «блудніца» – пазбаўленая імкнення да стварэння сям'і і сямейнага шчасця: выкарыстоўвае мужчын для дасягнення прыватных мэтаў; 4) «жанчына, блізкая да ідэалу» – не толькі імкнецца да самастойнасці, але і захоўвае жаноцкасць [17, с. 22–23].

М. Кавалык даследуе жаночыя вобразы ў творчасці У. Вінічэнкі і гэтаксама засяроджвае ўвагу на суаднясенні лёсу гераінь з традыцыйнымі грамадскімі ўяўленнямі пра жаночае прызначэнне. Даследчыца вылучае тыя ж жаночыя тыпы, але дае ім іншыя назвы: 1) эмансіпатка; 2) «пухнатая самачка» – «жан-

чына маці» альбо сексуальна прывабная «жанчына-драпежніца»; 3) «новая» ідэальная жанчына. Побач з гэтымі тыпамі М. Кавалык вылучае тыпы «музы-гетэры» і «куртызанкі» [18].

У дадзеных даследаваннях жаночыя персанажы разглядаюцца ў кантэксце сацыяльнай праблематыкі, значная ўвага надаецца аналізу канфліктаў, абумоўленых мадэрнізацыйнымі працэсамі, аўтарскай ацэнцы прадстаўніц розных сацыяльных груп. Аналіз сацыяльных і сацыяльна-гістарычных тыпаў дазваляе ўдакладніць стаўленне пісьменнікаў да грамадскіх праблем, вызначыць, якім чынам «жаночая гісторыя» адлюстроўвалася і мадэлявалася ў мастацкіх творах.

Супастаўленне псіхалагізаваных жаночых вобразаў дазваляе вылучыць і прааналізаваць асобныя псіхалагічныя тыпы. Падставай для вылучэння псіхалагічных тыпаў з'яўляецца вызначэнне рысаў характару гераінь, «сілы тэмпераменту і ступені аўтаномнасці жанчыны як індывідуума – ступені яе незалежнасці ад установак, выпрацаваных светам, дзе пануюць мужчыны» [19, с. 28]. Сціплая, нерашучая, залежная ад мужчын жанчына супрацьпастаўляецца самастойнай, смелай, незалежнай, актыўнай гераіне ў даследаваннях, прысвечаных творчасці У. Тэкерэя і А. Чэхава. Е. Пакіна на матэрыяле прозы В. Скота распрацавала тыпалогію жаночых вобразаў на падставе «вызначэння ролі гераіні ў развіцці і вырашэнні рознага віду канфліктаў, асаблівасцях партрэтнай характарыстыкі, атачэнні і г.д.» [20, с. 10]. У адпаведнасці з вылучанымі К. Юнгам псіхалагічнымі тыпамі (мысляр, сэнсорны, інтуітыўны) даследчыца прапанавала тры тыпы жаночых персанажаў: Амазонка, Сціплая гераіня і Сівіла (назвы тыпаў дадзены на падставе тэкстаў гістарычных раманаў В. Скота). Аналіз псіхалагічных тыпаў у мастацкай прозе дазваляе ўдакладніць, як ацэньваліся тыя ці іншыя жаночыя якасці, памкненні і ўчынкі, якія эпізоды душэўнага жыцця найбольш цікавілі пісьменнікаў, з чым звязвалася духоўная эвалюцыя альбо дэградацыя гераінь.

Пры распрацоўцы тыпалогіі жаночых персанажаў найбольш пашыранай з'яўляецца арыентацыя на вызначэнне іх сюжэтных функцый, што дазваляе вылучыць і прааналізаваць найбольш канцэптуальныя вобразы-матывы (3). Так, адным з першых даследаванняў жаночых вобразаў у еўрапейскай культуры лічыцца кніга Мэры Элман «Развагі пра жанчын» (1968), дзе выяўлены стэрэатыпы жаноцкасці і крытычныя стэрэатыпы ў ацэнках жаночых вобразаў. М. Элман вылучыла два вобразныя рады: першы – ракавая жанчына, распусніца, жанчына-монстр, дэман-знішчальнік; другі – узнёслая каханая, муза, гераіня, якая памірае пры родах. «Іранічны, злы аналіз гэтых праекцый мужчынскіх фантазій дапамог першым феміністкам асэнсаваць агульнакультурную структурную гендарную асіметрыю» [21, с. 193]. У прапанаванай тыпалогіі значным таксама з'яўляецца ацэначны фактар: у першым шэрагу пералічваюцца гераіні, надзеленыя адмоўнымі якасцямі, арыентаваныя на дэструктыўны тып паводзін, у другім шэрагу – станоўчыя гераіні, якія паэтызуюцца аўтарамі-мужчынамі. Нельга не адзначыць, што ў тыпалогіі М. Элман прынцыповая ўвага надаецца характару адносін паміж жанчынай і мужчынам, што дазваляе выкрыць аднолькавыя аўтарскія стратэгіі ў раскрыцці жаночай ідэнтычнасці і наданні ёй залежнай ад мужчынскіх жаданняў ролі.

Вобразы-матывы, вылучаныя М. Элман, прысутнічаюць у літаратуры розных краін, што адлюстравана ў вышэйзгаданых даследаваннях. Пералік вобразаў-матываў можа быць пашыраны на матэрыяле мастацкіх твораў розных нацыянальных літаратур і розных гістарычных перыядаў. Так, арыентацыя на вызначэнне сюжэтных функцый персанажаў і вылучэнне вобразаў-матываў ляжыць у аснове адной з самых грунтоўных работ, прысвечаных тыпалогіі жаночых вобразаў, – даследавання В. Кардапольцавай, праведзенага на матэрыяле рускай літаратуры [22, с. 46–114]. Тыпалогія В. Кардапольцавай была распрацавана на падставе даследаванняў Ю. Лотмана. Ю. Лотман вылучыў тры стэрэатыпы жаночых вобразаў у літаратуры: «жанчына, якая пяшчотна кахае, пачуцці якой разбіты»; «дэманічны характар, які смела разбурае ўсе ўмоўнасці мужчынскага свету», «тыповы літаратурна-побытавы вобраз – жанчына-гераіня. Характэрная рыса – уключанасць у сітуацыю супрацьпастаўлення жаночага гераізма жанчыны і духоўнай слабасці мужчыны» [22, с. 52]. Трансфармуючы тыпалогію Ю. Лотмана і звяртаючыся да тыпалогіі жаночых вобразаў А. Весяльніцкай, Н.К. Нуан і Н. Рыс, В. Кардапольцава прапанавала тыпалогію, якая грунтуецца на стаўленні гераінь «да ўдзелу ў грамадска карыснай працы, арыентацыі ў дачыненні да дома, сям'і, сацыяльнай ролі жонкі і маці, поглядаў на ўзнаўленне традыцыйных патрыярхатных адносін» [22, с. 55]. Да традыцыйнага тыпу даследчыца аднесла жанчын, здольных да самаахвярнасці, спачування, суперажывання: «жанчына-гаспадыня», неатрадыцыяналістка, «крыжовая сястра» (рус. «крестовая сестра»), «пакорлівая жанчына» (рус. «смиренница»). Да тыпу жанчын-гераінь адносяцца жанчына-змагарка, саветызаваная жанчына, феміністка, «гарачае сэрца» і «вучоная дама». Трэці тып – дэманічныя жанчыны («разнастайны, неаднародны, у пэўнай ступені палярны, які спалучае як «мадонскі», так і «садомскі» пачатак») уключае вобразы жанчыны-музы, жанчыны-прыза, эскэпісткі і «ракавой жанчыны» [22, с. 55].

Апісанне вылучаных тыпаў на матэрыяле рускай літаратуры дазваляе ўявіць разнастайнасць жаночых вобразаў у рускай культуры, іх канцэптуальную значнасць у класічных сюжэтах мастацкай прозы і сувязь з пашыранымі ўяўленнямі пра жаночы лёс, жаночае прызначэнне і ідэал жаноцкасці. Да тыпалогіі В. Кардапольцавай звяртаюцца сучасныя расійскія даследчыкі: А. Пацехіна, В. Халапоніна і інш.

Аднак нельга не заўважыць некаторыя недахопы гэтай тыпалогіі. Так, спрэчным з'яўляецца аднясенне вобразаў жанчыны-музы, жанчыны-прыза і эскэпісткі да «дэманічнага» тыпу. Відавочнай памылкай з'яўляецца дзяленне па розных асновах (fundamentum divisionis): саветызаваная жанчына, феміністка, неатрадыцыяналістка – гэта сацыяльныя тыпы, «жанчына-гаспадыня», «крыжовая сястра», «пакорлівая жанчына» – вобразы-матывы.

У 2005 годзе В. Кардапольцава зноў звярнулася да праблемы стратыфікацыі жаночых вобразаў і прапанавала наступныя кірункі даследавання рэпрэзентацыі жаноцкасці ў гісторыі культуры:

- у аспекце гісторыка-культурнага развіцця грамадства: першабытнае грамадства, старажытныя цывілізацыі, Сярэднявечча, Адраджэнне і г.д.;
- у аспекце ролевых суб'ектна-аб'ектных дачыненняў у сям'і: маці, жонка, дачка, сястра, нявеста;
- у аспекце сацыяльна-ролевай прэзентацыі ў грамадстве: хатняя гаспадыня, работніца, кіраўнік, бізнесмен і г.д.;
- у сацыяльна-класавым аспекце: шляхцянка, сялянка, мяшчанка, работніца, прадпрымальнік;
- у псіхолага-дзейсным аспекце: традыцыйная, гераіня, дэманічная жанчына;
- у аспекце мастацка-эстэтычнай прэзентацыі жанчыны ў якасці аб'екта творчага ўвасаблення ў літаратуры, жывапісу, скульптуры (муза, натхняльніца, чараўніца);
- у маральна-этычным аспекце на ўзроўні сімваліка-семіятычным: «вавілонская блудніца», Ева, вялікая грэшніца, Святая Магдаліна, Святая Марыя, Вялікая Праведніца;
- у філасофска-сімвалічным аспекце: Вечная Жаноцкасць, Сафія – Прамудрасць Божая, Прыўкрасная Дама, Маці-Сырая Зямля, Радзіма-Маці і г.д. [23, с. 66].

Такім чынам, тыпалогія, прапанаваная ў 2000 годзе, была ўдакладненая і перапрацаваная (напрыклад, муза і дэманічная жанчына не ўваходзяць у адну групу вобразаў). Вылучаны сімвалічныя вобразы і вобразы-архетыпы, якія часта аналізуюцца даследчыкамі – так, вобразу маці (сімвал Радзімы альбо нацыі) надаецца значная ўвага ў работах А. Шчарбак, І. Воюш, Т. Емчук. На сімваліка-семіятычным узроўні В. Кардапольцава вылучыла групу біблійных персанажаў і хрысціянскіх архетыпаў, рэмінісцэнцыі і алюзіі да якіх прысутнічаюць у творах многіх пісьменнікаў.

Галоўная рыса навуковага падыходу В. Кардапольцавай – спалучэнне эмпірычнага і тэарэтычнага падыходаў да тыпалогіі жаночых вобразаў і вызначэння прадуктыўных кірункаў для аналізу рэпрэзентацыі жаноцкасці ў гісторыі культуры. В. Кардапольцава падагульніла метадалагічныя прынцыпы, якія ляжаць у аснове даследаванняў па гендаралогіі і гісторыі літаратуры. Безумоўна, у літаратуразнаўстве ёсць нямала работ, дзе жаночыя вобразы разглядаюцца ў аспектах, вызначаных В. Кардапольцавай. Так, у вышэйзгаданых даследаваннях А. Бярозкінай і Ф. Ісмаілавай асновай тыпалогіі з'яўляецца сацыяльна-ролевая прэзентацыя гераінь у грамадстве.

Жаночыя персанажы нярэдка аналізаваліся ў аспекце ролевых суб'ектна-аб'ектных дачыненняў у сям'і, што дазваляла вызначыць сацыякультурную абумоўленасць вобразаў і прасачыць, як змяняліся падыходы да рэпрэзентацыі жаноцкасці. Так, у даследаванні І. Воюш была пастаўлена задача распрацаваць тыпалогію жаночых вобразаў «паводле іх сацыяльна-родавай функцыі» [24, с. 10] на матэрыяле беларускай мастацкай прозы XX ст. Аналізуючы творы Ядвігіна Ш., М. Гарэцкага, Міхася Зарэцкага, Кузьмы Чорнага, І. Мележа, І. Воюш прадэманстравала, што «агульная тэндэнцыя трансфармацыі зместу жаночага вобраза ў літаратуры XX ст. заключалася ў паступовым наданні яму рысаў аб'екта, а потым і суб'екта сацыяльнай практыкі. У адзін шэраг з традыцыйнымі якасцямі жаночага характару сталі дагэтуль не ўласцівыя ёй характарыстыкі, якія спрадвеку належалі героям-мужчынам» [24, с. 10]. Даследчыца прыйшла да высновы, што «паводле функцыянавання ў мастацкай прасторы жаночы вобраз можа прадстаўляць прыватна-сямейную альбо сацыяльную плынь аповеду ці існаваць на іх сумежжы. Ролі злой / добрай жонкі, злой / добрай нявесткі, свекрыві, маці і мачыхі, роднай / нянроднай дачкі, каханай дзяўчыны з'яўляюцца найбольш характэрнымі для прыватна-сямейнай сферы, а сацыяльна актыўных і сацыяльна пасіўных жанчын – для прадстаўніц сацыяльнай лініі твора» [24, с. 10]. Сапраўды, у беларускай літаратуры 1900–1920-х гг. пісьменнікі часта звярталіся да праблемы ўзаемаадносін у сям'і – адпаведна, жаночыя персанажы, як правіла, надзяляліся станоўчымі ці адмоўнымі якасцямі і пазіцыянаваліся як прыклад ці антыпрыклад.

Узор паслядоўнага, дакладнага аналізу жаночых вобразаў – даследаванне, выкананае Т. Емчук на матэрыяле творчасці Р. Іванычука і Г. Грына [25, с. 9–10]. Тыпы жаночых вобразаў вызначаюцца праз прызму парадыгмы «жанчына-мужчына». Даследчыца звярнулася да метадалогіі посткаланіяльных даследаванняў і выявіла, што ў прозе дадзеных аўтараў «свет жанчыны з'яўляецца альтэрнатыўным імперскаму ці каланізатарскаму дыскурсу» [25, с. 9]. «Вобразы жанчыны-пакутніцы, рабыні, повіі, каханкі, сексуальнай жанчыны ў антыкаланіяльным рамане ўвасабляюць калонію, а вобразы мужчын, з якімі гэтыя жанчыны маюць пэўныя стасункі, – метраполію» [25, с. 9]. На іншым полюсе знаходзяцца вобразы жанчыны-маці, анёла, берагіні, вернай спадарожніцы, «якія разглядаюцца ў стасунках з мужчынамі і прадстаўляюць іх нацыю. Гэтыя вобразы ўвасабляюць памкненне прыгнечанай краіны захаваць

уласную ідэнтычнасць, падтрымліваць і натхняць сваіх мужчын у змаганні за незалежнасць» [25, с. 10]. У дадзеным выпадку даследчыца звярнула ўвагу на сімвалічнасць жаночых вобразаў у антыкаланіяльнай прозе, прычым семантыка дадзеных вобразаў пры іх алегарычным прачытанні з'яўляецца канстантнай для розных літаратур.

Тыпалогіі вобразаў-персанажаў, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца ў літаратуразнаўстве, і прапанаваны В. Кардапольцавай падыход да стратыфікацыі жаночых вобразаў дазваляюць выявіць недахопы асобных работ, прысвечаных тыпалогіі жаночых вобразаў. Калі ў адных работах канкрэтна вызначаецца аснова тыпалогіі [20; 25], то ў іншых работах аснова тыпалогіі не агаворваецца, і ў адным шэрагу пералічваюцца тыпы, вылучаныя на розных асновах. Так, адзін з падраздзелаў дысертацыі Н Сенчыла мае назву «Тыпалогія жаночых вобразаў у турэцкай сацыяльнай навэле: маці, жабрачка, повія» [26, с. 5]. Тып маці вылучаецца на падставе вызначэння ролі гераіні у сям'і, тып жабрачкі – у сацыяльна-класавым аспекце (жабрачка = люмпэнка), тып повіі – у аспекце сацыяльна-ролевай прэзентацыі ў грамадстве (прычым у адрозненні ад папярэдніх тыпаў вызначальным з'яўляецца лад жыцця гераіні, спецыфіка яе дачыненняў з мужчынамі). Тыпы маці, жабрачкі і повіі вылучаны на розных асновах. Сістэмны аналіз жаночых вобразаў у навелах прадугледжваў бы паслядоўнае супастаўленне жаночых персанажаў, якія вылучаюцца ў адным аспекце: маці, дачка, жонка; жабрачка, прадстаўніца вышэйшага класу, жанчына-працаўніца; повія, верная жонка, адзінокая жанчына. У артыкуле па тэме дысертацыі прысутнічае толькі апошняе супастаўленне. На прыкладзе гэтага тэксту выразна відаць, што вылучэнне найбольш яркіх альбо найбольш характэрных для пэўнага корпусу тэкстаў жаночых тыпаў не з'яўляецца тыпалогіяй, бо ў класічным разуменні тыпалогія прадугледжвае максімальна поўнае і адназначнае адлюстраванне сістэмы праз апісанне і супастаўленне тыпаў, якія выяўляюцца на адной аснове. Адпаведна, тэрмін «тыпалогія» ў дадзеным выпадку ўжыты не карэктна.

Нельга лічыць тыпалогіяй і прапанаваны А. Бярозкінай падзел жаночых персанажаў у раманістыцы 70–80-х гадоў на «новых жанчын» і «жанчын на ростанях». Безумоўна, у творах гэтага перыяду прысутнічалі і гераіні, якія ігнаравалі новыя магчымасці сацыяльнай рэалізацыі; аналіз гэтых персанажаў дазволіў бы вылучыць яшчэ некалькі тыпаў і такім чынам больш сістэмна падысці да даследавання абраных твораў. Вельмі часта даследчыкі засяроджваюцца на даследаванні вобразаў-тыпаў, цэнтральных для творчасці пэўнага аўтара, – аднак, праз аналіз менш частотных вобразаў таксама можна выявіць істотныя тэндэнцыі, удакладніць асаблівасці аўтарскага светапогляду. Сістэмны падыход да аналізу жаночых вобразаў прадугледжвае разгляд і апісанне ўсіх тыпаў, якія вылучаюцца на адной аснове.

Такім чынам, даследаванні жаночых вобразаў маюць міждысцыплінарны характар: аналіз сістэмы персанажаў з улікам гендарнай метадалогіі – гэта выйсце ў сферу сацыялогіі, псіхалогіі, культуралогіі. У аспекце літаратуразнаўчым вывучэнне жаночых вобразаў прадугледжвае выяўленне архетыпаў, вобразаў-сімвалаў, алюзій і рэмінісцэнцый; удакладненне асаблівасцей аўтарскага стылю (адметнасці аўтарскага падыходу да стварэння партрэтных апісанняў гераінь, іх маўленчых характарыстык, канструявання сюжэтных сітуацый і г.д.). Жаночыя вобразы часта маюць рэальных прататыпаў, а значыць іх разгляд дазваляе пашырыць веды пра біяграфію пісьменніка, да таго ж рэпрэзентацыя жаноцкасці ў мастацкіх творах – магчымасць удакладніць аўтарскі светапогляд, стаўленне пісьменніка да сацыяльных праблем, гендарных стэрэатыпаў і ідэалаў.

Пры гэтым тыпалогіі жаночых вобразаў, прапанаваныя сучаснымі літаратуразнаўцамі, у пераважнай большасці з'яўляюцца эмпірычнымі: у работах фіксуюцца ўстойлівыя прыкметы і адрозненні, якія знаходзяцца індуктыўным шляхам; атрыманы матэрыял інтэрпрэтуецца і сістэматызуецца. Пры распрацоўцы тыпалогіі жаночых вобразаў даследчыкі, як правіла, вылучаюць тыпы на падставе аўтарскага стаўлення да персанажаў, вызначэння псіхалагічных, сацыяльных, сацыяльна-гістарычных тыпаў, сюжэтнай функцыі персанажаў – а значыць, арыентуюцца на класічныя літаратуразнаўчыя падыходы. З аднаго боку, гэта дэманструе нязменную актуальнасць традыцыйных падыходаў да аналізу вобразаў-персанажаў. З іншага боку, сведчыць, што развіццё гендарных даследаванняў пакуль не прывяло да выпрацоўкі кардынальна новых падыходаў да тыпалогіі жаночых персанажаў.

Разглядаючы магчымыя варыянты класіфікацыі персанажаў, даследчыкі вылучаюць два асноўныя тыпы класіфікацый: генерычныя (агульныя і патэнцыяльна разлічаныя на кожны мастацкі тэкст) і іманентныя (вынікаюць з мастацкай сістэмы канкрэтнага аўтара) [27, с. 235]. Літаратуразнаўцы, якія распрацоўваюць тыпалогіі жаночых вобразаў у межах аўтаразнаўчай паэтыкі, як правіла, арыентуюцца на іманентны падыход. Гэтым прапанаваныя тыпалогіі прыкметна адрозніваюцца ад генерычных тыпа-логій персанажаў М. Бахціна, Л. Гінзбург, А. Андрэева і іншых тэарэтыкаў. Літаратуразнаўцы-тэарэтыкі прапаноўваюць новыя тыпалогіі персанажаў, аналізуючы структуру літаратурнага героя, агульныя прынцыпы літаратурнай творчасці, кампазіцыю мастацкіх твораў, дынаміку літаратурнага працэсу.

Так, М. Бахцін прааналізаваў спецыфічна эстэтычную рэакцыю пісьменніка на цэлае «чалавекагероя», якая «збірае ўсе пазнавальна-этычныя вызначэнні і ацэнкі і завяршае іх у адзінае і адзінкавае канкрэтна-светапогляднае і сэнсавае цэлае» [3, с. 8], і вылучыў чатыры тыпы стаўлення аўтара да свайго

героя (што можна разглядаць у тым ліку як аснову для стратыфікацыі вобразаў-персанажаў): неадпаведнасць («вненаходимость») аўтара герою; герой авалодвае аўтарам; аўтар авалодвае героем, уносіць у яго завяршальныя моманты; герой з'яўляецца сам сваім аўтарам, асэнсоўвае сваё жыццё эстэтычна [3, с. 10–21]. Л. Гінзбург разгледзела «розныя гістарычныя формы персанажаўтварэння» [28, с. 124] і вылучыла такія тыпы герояў, як маска, тып, характар, герой-ідэя, герой-сімвал, герой, амаль роўны працэсу свядомасці [28, с. 123–143]. Даследаванне «розных тыпаў узаемадзеяння паміж прыкметамі літаратурнага персанажа» [28, с. 123] праводзілася ў кантэксце аналізу змены мастацкіх кірункаў, творчых метадаў, падыходаў прадстаўнікоў розных мастацкіх школ да праблемы вобраза-персанажа. Літаратуразнаўца А. Андрэеў, аналізуючы дачыненні паміж героем і грамадствам, светапогляд героя, яго духоўныя параметры, суадносіны пазнання і прыстасавання, вылучыў тыпы персонацэнтрычнага, індывідуацэнтрычнага і соцыяцэнтрычнага героя і вызначыў суаднесенасць розных тыпаў героя з літаратурнымі жанрамі і відамі пафасу [29, с. 136–143].

У адрозненні ад генерычных тыпалогій, прапанаваных тэарэтыкамі, у эмпірычных, іманентных тыпалогіях жаночых вобразаў вылучэнне канкрэтных тыпаў адбываецца на аснове літаратуразнаўчай традыцыі, даследчыкі не засяроджваюцца на вылучэнні сістэмаўтваральных сувязей, не імкнуцца праз стварэнне тыпалогіі растлумачыць аб'ект і стварыць яго тэорыю. Асноўная ўвага надаецца абумоўленасці канструявання жаночых вобразаў сацыякультурнай сітуацыяй, што тлумачыцца ў тым ліку спецыфікай гендарнай метадалогіі.

**Заключэнне.** Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць выснову, што ў літаратуразнаўстве і гендаралогіі адсутнічае ўніверсальная (генерычная) тыпалогія жаночых вобразаў, няма агульнапрынятага і канцэптуалізаванага метадалагічнага падыходу да аналізу жаночых вобразаў. Пры распрацоўцы тыпалогіі жаночых персанажаў даследчыкі, як правіла, вылучаюць тыпы на падставе аўтарскага стаўлення да персанажаў, вызначэння псіхалагічных, сацыяльных, сацыяльна-гістарычных тыпаў, сюжэтнай функцыі персанажаў – а значыць, арыентуюцца на класічныя літаратуразнаўчыя падыходы. Тыпалогія жаночых вобразаў паўстае заўсёды ўнікальным працэсам, аўтары не выкарыстоўваюць адзіную метадалогію, пры гэтым іх высновы і даследчыцкія стратэгіі часта супадаюць (напрыклад, пры аналізе твораў аднаго перыяду). Да недахопаў асобных работ можна аднесці некрытычнае выкарыстанне розных асноў для тыпалогіі аб'ектаў, няпоўны ахоп вылучанага мноства.

Распрацоўка методыкі гендарнага аналізу тэкстаў з'яўляецца адной з галоўных задач гендарнага літаратуразнаўства. На сучасным узроўні бачыцца прадуктыўным стварэнне генерычнай тыпалогіі вобразаў-персанажаў, пры якой супастаўленне жаночых вобразаў у межах адной групы дазволіла б зрабіць высновы пра асноўныя мастацкія падыходы да канструявання жаноцкасці. Гэта дапамагло б звязаць высновы, зробленыя на эмпірычным узроўні пры даследаванні мастацкіх тэкстаў, з тэарэтычнымі выкладкамі гендаролагаў, якія, як правіла, маюць абагульняльны характар, і такім чынам удакладніць ці нават падкарэктаваць асноўныя палажэнні гендаралогіі ў дачыненні да канкрэтнага гістарычнага перыяду.

ЛІТАРАТУРА

1. Бовуар, С. Второй пол / С. де Бовуар ; пер. с фр. А. Сабашниковой [и др.] ; общ. ред и вступ. ст. С. Айвазовой ; коммент. М. Аристовой. – СПб. : Изд. группа «Прогресс»; Алетейя, 1997. – 831 с.
2. Теория литературы : учеб. пособие для студ. филол. фак. высш. учеб. Заведений : в 2 т. / под ред. Н.Д. Тамарченко. – М. : Издательский центр «Академия», 2004. – Т. 1 : Теория художественного дискурса. Теоретическая поэтика / Н.Д. Тамарченко, В.И. Тюпа, С.Н. Бройтман. – 2004. – 512 с.
3. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин ; сост. С.Г. Бочаров ; текст подгот. Г.С. Бернштейн и Л.В. Дерюгина ; прим. С.С. Аверинцева и С.Г. Бочарова. – М. : Искусство, 1979. – 424 с.
4. Гончарова, Е.А. Категории автор-персонаж и их лингвостилистическое выражение в структуре художественного текста / Е. А. Гончарова. – Л. : Ленингр. гос. пед. ин-т им. А.И. Герцена, 1989. – 32 с.
5. Пропп, В.Я. Морфология (исторические корни) волшебной сказки / В.Я. Пропп. – М. : Лабиринт, 1998. – 511 с.
6. Греймас, А-Ж. Структурная семантика / А-Ж. Греймас. – М. : Академический проект, 2004. – 367 с.
7. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX – XX вв.: Трактаты, ст., эссе / сост, общ. ред. Г.К. Косикова. – М. : Изд-во МГУ, 1987. – 510 с.
8. Комлев, Н.Г. Словарь иностранных слов / Н.Г. Комлев. – М. : ЭКСМО-пресс, 2000. – 669 с.
9. Гаспаров, М.Л. Избранные труды. / М.Л. Гаспаров. – М. : Языки русской культуры, 1997–2012. – Т. 2 : О стихах. – 1997. – 501 с.
10. Макаричев, Ф.В. Динамическая типология героев Ф.М. Достоевского : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.01 / Ф. В. Макаричев ; Магнитогорский гос. ун-т. – Магнитогорск, 2002. – 44 с.
11. Поль, Д.В. Проблемы поэтики и эстетики М.А. Шолохова / Д.В. Поль. – М. : ИХО РАО, 2007. – 148 с.
12. Щербак, О.В. Типологія жіночих образів у давній українській літературі : дис… канд. філол. наук : 10.01.01 / О.В. Щербак. – Житомир, 2016. – 188 л.
13. Строганова, Е. Категория «гендер» в изучении истории русской литературы / Е. Строганова // Пути и перспективы интеграции гендерных методов в преподавание социально-гуманитарных дисциплин : материалы науч. конф., Тверь, 2000. – С. 32–37.

14. Сенчило, Н.О. Типологія жіночих образів у турецкій соціальній новелі першої половины XX століття / Н.О. Сенчило // Наукові записки. Серія «Філологічна». – Острог : Видавництво «Острозьска академія», 2012. – Вип 27. – С. 263–267.
15. Березкина, Е.П. Типология женских образов в народническом романе (на материале творчества Н.А. Арнольди, С.И. Смирновой, Н.Д. Хвощинской, О.А. Шапир) : автореф. дис. … канд. филол. Наук : 10.01.01 / Е.П. Березкина ; Бурятский гос. ун-тет. – Улан-Удэ, 2004. – 26 с.
16. Исмаилова, Ф.Е. Типология женских образов в казахской прозе 20 – 30-х годов : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.01 / Ф.Е. Исмаилова ; Казах. гос. ун-т им. С.М. Кирова. – Алма-Ата, 1989. – 22 с.
17. Хуан-Син, Л. Женские образы в прозе Чехова : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.01 / Л. Хуан-Син ; Московский гос. ун-т им. М.В. Ломоносова. – М., 2002. – 23 с.
18. Ковалик, М.О. Типологія жіночіх характерів у прозі та драматургіі Володимира Винниченка : автореф. дис. … канд. філол. Наук : 10.01.01 / М.О. Ковалик ; Кіровоградський державний педагогічний університет імені Володимира Винниченка. – Кіровоград, 2007. – 24 с.
19. Авраменко, Е.И. Типология образов и ранневикторианский конструкт женственности в романах У.М. Теккерея о прошлом / Е.И. Авраменко // Наукові записки ХНПУ. Серія «Літературознавство». – 2010. – Вип. 2 (62), частина 1. – С. 28–34.
20. Пакина, Е. Типология женских образов в романах В. Скотта : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.03 / Е. Пакина ; Нижегородский гос. пед. ун-т. – Н. Новгород, 2004. – 21 с.
21. Кабанова, И. Западная феминистская критика о «женском письме»: типологический анализ основных направлений / И. Кабанова // Женский вызов: русские писательницы XIX – начала XX века / под ред. Е. Строгановой и Э. Шоре. – Тверь : Лилия Принт, 2006. – 316 с.
22. Кардапольцева, В.Н. Женские лики России / В.Н. Кардапольцева. – Екатеринбург : Гуманитарный университет, 2000. – 160 с.
23. Кардапольцева, В.Н. Женственность как социокультурный конструкт / В.Н. Кардапольцева // Вестник РУДН. Серия «Социология». – 2005. – № 1(8). – С. 62–76.
24. Воюш, І.Д. Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе XX стагоддзя : дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.01 / І.Д. Воюш ; БДУ. – Мінск, 2004. – 111 л.
25. Ємчук Т. Б. Типологія художнього осмислення тоталітаризму в антиколоніальній прозі другої половини XX ст. (романи Р. Іваничука та Г. Гріна) : автореф. дис. … канд. філолог. Наук : 10.01.05 / Т. Б. Ємчук ; Тернопільський нац. пед. ун-тет ім. Володимира Гнатюка. – Тернопіль, 2007. – 20 с.
26. Сенчило, Н.О. Соціальна турецька новела першої половины XX століття: жанрові особливості, типологія героїв : автореф. дис… канд. філол. Наук : 10.01.04 / Н.О. Сенчило ; Київський національний університет Тараса Шевченко. – Київ, 2013. – 19 с.
27. Середа, И.А. Проблема типологии героев как объект литературоведческого исследования (на примере классификации персонажей В. Маканина) / И.А. Середа // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф. маладых навукоўцаў, Мінск, 27 сак. 2015 г. / рэдкал. І. П. Навойчык [і інш.] ; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 234–239.
28. Гинзбург, Л.Я. О литературном герое / Л.Я. Гинзбург. – Л. : Сов. писатель, 1979. – 222 с.
29. Андреев, А.Н. Аксиомы персоноцентрического литературоведения / А.Н. Андреев. – Минск : БГУ, 2015. – 222 с.

*Паступіў 19.06.2018*

## TYPOLOGIZATION CRITERIA FOR WOMEN CHARACTERS IN MODERN CRITICAL STUDIES

***A. CHARNAVOKAYA***

*The objective of this article is to correlate typologies of female characters, offered in modern researches, with the typologies of characters, traditionally used in literary criticism. Works, written by Belarussian, Russian and Ukrainian researchers (I. Voyush, V. Kardapoltsava, A. Pakina, T. Emchuk, etc.) were examined and compared. It's concluded, that the development of gender studies hasn't generated a new approach to typology of female characters. The types of female images, as a rule, are distinguished on the basis of the author's relation to characters, definition of psychological, social types, subject function of characters – so, literary critics are oriented to the classical literary approaches. Typologies of female images are mostly empirical and immanent, the main attention in the researches is given to the relationship between female images and real social, cultural, political situation.*

***Keywords:*** *female characters; typology; contemporary literature studies; gender studies; psychological types; social types.*